вольнага часу, што садзейнічае іх узаемадзеянню з грамадствам і сацыяльнай рэалібітацыі. Асабліва гэта адчуваюць дзеці-інваліды, якіх запрашаюць на бібліятэчныя мерапрыемствы, далучаюць да розных відаў творчай дзейнасці. Так, у рамках праграмы "Дабрыня" Светлагорскай РЦБС прайшлі конкурсы малюнкаў "Залатая кісточка" і "Акно радасці". Раённы конкурс творчасці дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі адбыўся ў Лельчыцкай ЦБС. У Асіповіцкай дзіцячай бібліятэцы, якая працуе пад дэвізам "Высокае слова — міласэрнасць", работа з дзецьмі-інвалідамі вядзецца па праграме "Дапамога бліжняму". У ходзе яе рэалізацыі арганізаваны пастаянна дзеючы рух "Дзеці Гіпакрата", у рамках якога праводзяцца дні міласэрнасці, дні дабрыні, дні спачування і інш. Пры ўдзеле дзіцячай бібліятэкі на базе школы № 3 створаны дабрачынны цэнтр "Ім патрэбен наш клопат", члены якога дапамагаюць у арганізацыі і правядзенні мерапрыемстваў для дзяцей-інвалідаў. Для іх распрацавана таксама развіваючая праграма, заснаваная на прынцыпах гульні і творчасці дзяцей. Для бацькоў дзяцей-інвалідаў створаны клуб "Чулае сэрца", у праграме работы якога не толькі разнастайныя мерапрыемствы, але і сустрэчы з псіхолагамі, урачамі, сацыяльнымі работнікамі.

Далучылася Асіповіцкая ЦБС да рэалізацыі праекта Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі "Жыццё патрабуе міласэрнасці". На яе базе пачаў працаваць цэнтр дзіцячага і сямейнага навучання "Нескучная книга", створаны школа-семінар для бацькоў, клуб выхаднога дня "Бібліняня".

Для дзіцячых бібліятэк г.Мінска стала ўжо традыцыяй праводзіць мерапрыемствы ў Рэспубліканскім дзіцячым анкалагічным дыспансеры ў Бараўлянах (ЦГДБ), у дзіцячым аддзяленні навукова-даследчага інстытута уралогіі (бібліятэка № 6), спецшколах і інш.

Не пакідаюць бібліятэкі без увагі і дзяцей-сірот. Наладжаны сувязі з дзіцячымі дамамі і школамі-інтэрнатамі, выхаванцы якіх — частыя ўдзельнікі бібліятэчных мерапрыемстваў. Некаторыя бібліятэкі выступаюць ініцыятарамі збору сродкаў для дзяцей-сірот, з дапамогай сваіх чытачоў рыхтуюць падарункі да святаў, дзён нараджэння.

Мэтанакіравана працуе з дзецьмі з праблемных сем'яў дзіцячае аддзяленне Рэчыцкай ЦБС. Тут распрацавана спецыяльная творчая праграма, накіраваная на вывучэнне псіхалагічнага стану чытачоў-дзяцей і іх бацькоў з мэтай карэкцыі выяўленых адхіленняў ад нормы паводзін. Праводзіць работу на належным узроўні дазваляе наяўнасць у штаце бібліятэкі псіхолага.

Не меншае значэнне мае ўдзел у бібліятэчных мерапрыемствах і для дарослых людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Унікальнае асяроддзе для іх зносін стварыла бібліятэка № 16 г.Мінска, размешчаная ў будынку гарадскога дома ветэранаў № 1. Для насельнікаў дома бібліятэка стала сапраўднай аптэкай для душы, куды прыходзяць не толькі за кнігамі і часопісамі, але і каб падзяліцца сваімі навінамі і праблемамі, звярнуцца за дапамогай, сустрэцца з псіхолагамі, медыцынскімі і сацыяльнымі работнікамі, прадстаўнікамі духавенства, народнымі лекарамі. Сустрэча за кубачкам гарбаты "Мы побач з Вамі", калядныя сустрэчы "Сагрэем душу цёплым словам", прэзентацыя кнігі паэта, члена літаратурнага аб'яднання інвалідаў М.Сотнікава "Белый сад", літаратурна-музычная кампазіцыя "Нам гады не бяда" — вось далёка не поўны пералік мерапрыемстваў, арганізаваных бібліятэкай для ветэранаў і інвалідаў. Асаблівае ўражанне пакінула выстаўка рукадзелля "Свой дом упрыгожу я сама", у якой прынялі ўдзел і жыхары мікрараёна.

Своеасаблівай формай сацыяльна-псіхалагічнай падтрымкі сталі разнастайныя аматарскія аб'яднанні для людзей пенсійнага ўзросту. Тэматыка мерапрыемстваў што праводзяцца ў іх рамках, такая ж разнастайная, як і дыяпазон інтарэсаў пажылых людзей. Удзел у іх дазваляе сумяшчаць адпачынак з набыццём чыста практычных ведаў па пытаннях вядзення хатняй гаспадаркі, рукадзелля, садаводства і агародніцтва. Абавязковымі з'яўляюцца сустрэчы з сацыяльнымі і медыцынскімі работнікамі, псіхолагамі, юрыстамі.

Часта аб'ектам павышанай увагі бібліятэк, іх сацыяльна-псіхалагічнай падтрымкі становяцца падлеткі. Менавіта з гэтай мэтай створаны клуб "Выратавальны круг" пры Нясвіжскай ЦРБ і цэнтр "САМ" (сацыяльнай адаптацыі моладзі) у Слуцкай ЦГБ. Салігорская ЦРБ работу з гэтай групай вядзе па мэтавай праграме "Падлетак", у рамках якой распрацаваны інфармацыйна-асветніцкі маніторынг "У зоне асаблівай увагі" і створана школа "Падлетак: надзеі і трывогі", галоўная мэта якой — дапамога ў пераадоленні цяжкасцей падлеткавага ўзросту і арыентацыя на здаровы лад жыцця. Надзвычай вялікае месца ў рабоце з гэтай катэгорыяй чытачоў займалі мерапрыемствы, накіраваныя на прафілактыку такіх негатыўных з'яў, як наркаманія, п'янства, СНІД.

Адчуваецца ўзмацненне сацыяльна-псіхалагічных аспектаў у рабоце бібліятэк з сем'ямі. Так у Слуцкай гарадской ЦБС у рамках праграмы "Вытокі" створаны цэнтр псіхалагічнай дапамогі сям'і. Такую ж накіраванасць мае клуб "Сямейная акадэмія". Адно з яго мерапрыемстваў — вечар сямейнай тэрапіі "Вытокі вялікага канфлікту". З мэтай стварэння атмасферы ўзаемапаразумення ў сям'і тут распрацаваны двухгадовы лекторый.

Кансультацыйны цэнтр у дапамогу маладым сем'ям арганізаваны ў Лельчыцкай ЦРБ. У бібліятэцы № 2 г.Мінска пачала стварацца камп'ютэрная праграма "Сацыяльна-псіхалагічная адаптацыя сям'і". Паспяхова працуюць у філіяле № 4 г.Барысава псіхалагічны практыкум "Пазнай сябе" і "Бацькоўскі універсітэт". На базе адной з сярэдніх школ дзейнічае цэнтр педагагічнай рэабілітацыі.

Узяты на ўлік у бібліятэках шматдзетныя і няпоўныя сем'і, апекуны дзяцей і сірот, сем'і загінуўшых у Аўганістане. Усім ім адрасаваліся тыя ці іншыя мерапрыемствы ў адпаведнасці з іх інтарэсамі і патрэбамі.

Не пакідаюць бібліятэкі без увагі і жанчын. Менавіта яны часцей за ўсё з'яўляюцца членамі клубаў і аматарскіх аб'яднанняў, якія не толькі дапамагаюць цікава і карысна правесці вольны час, але і садзейнічаюць іх сацыяльнай рэабілітацыі. Даволі шырокае кола пытанняў інфармацыйна-бібліятэчнага абслугоўвання жанчын і іх сем'яў прадугледжана ў праграме "Свет жанчыны: публічныя бібліятэкі г.Мінска чытачам-жанчынам". Тут і разнастайныя мерапрыемствы, адрасаваныя розным узроставым катэгорыям, і дабрачынная работа з малазабяспечанымі і шматдзетнымі сем'ямі, пенсіянерамі, жанчынамі-інвалідамі і інш.

Прыведзеныя факты з жыцця публічных бібліятэк з'яўляюцца пераканаўчым сведчаннем таго, што для многіх катэгорый насельніцтва апошнія сталі даволі значнымі цэнтрамі сацыяльна-псіхалагічнай падтрымкі. І здзяйсняецца яна як з дапамогай усяго комплексу ўнутраных бібліятэчных сродкаў, так і шляхам далучэння да гэтай работы спецыялістаў з іншых галін, носьбітаў гэтай дапамогі. Але асобую ролю ўсё ж адыгрываюць кніга і своеасаблівае асяроддзе самой бібліятэкі, якая ў нашых складаных жыццёвых умовах для многіх грамадзян стала сапраўднай бібліятэрапеўтычнай службай.

Summary

The activity of public libraries of Belarus as centers of social and psychological encouragement is generalized in this article.